**УДК 39**

# ТРАДЫЦЫЙНАЯ КАЛЯНДАРНАЯ АБРАДНАСЦЬ БЕЛАРУСАЎ АРШАНСКАГА РЭГІЁНУ: ВОСЕНЬСКА-ЗІМОВАГА ПЕРЫЯДУ

***Я.А. ЕЎТУШЭЎСКІ***
***(Прадстаўлена: д-р гіст. навук, дац. У.А. ЛОБАЧ)***

*Ад старажытнасці восеньскі перыяд быў часам, насычаным каляндарнымі абрадамі рознай семантыкі. Сімвалічнае ядро абрадаў восеньска-зімовага перыяду складала аграрная прагматыка, што абумоўлена гаспадарчай спецыфікай беларускага традыцыйнага грамадства. На гэты ж час прыходзіцца і рытуальнае ўшанаванне продкаў, вядомае на тэрыторыі ўсёй Беларусі пад назваю "Дзяды".*

**Дажынкі.** Традыцыйная культура беларусаў цесна звязана з зямлёй, земляробствам. Многія святы, звычаі і традыцыі бяруць свой пачатак з падзей, цесна звязаных з земляробчым календаром. Дажынкі, мабыць, самае вядомае з такіх святаў, якое прынагоджана да завяршэння жніва. Гэты старажытны абрад вядомы практычна ўсім народам, якія займаюцца земляробствам. З даўніх часоў Дажынкі адзначалі на фінальнай стадыі жніва, гарачай уборачнай пары і цяжкай працы, таму і святкавалі яго заўсёды з размахам. У апошні дзень жніва на полі збіралася талака – добраахвотныя памочнікі, сярод якіх былі сваякі, сябры, суседзі. Самая старэйшая і паважаная жанчына паказвала, дзе каму жаць і першай пачынала жніво. Праца жанчын суправаджалася адмысловымі абрадавымі песнямі. Так, у Аршанскім раёне спявалі:

*Ой рана, рана / На лес раса пала, / Раса сцюдзёная. / Ой, раней таго / Маладая ўставала, / Расіцу аббівала. / Як угледзеў / А мой жа міленькі, / На коніку седзячы. /- Ты ж. мілая, / Не хадзі босая, / Раса сцюдзёная. /- Мой міленькі. / Калі табе жалка. / Купі чаравічкі. /- Ты ж, мілая. / Калі ж будзеш мая, / Куплю табе двое. / Куплю табе двое, / Казловы абое*"[6].

Вельмі часта лейтматывам жніўных песняў была цяжкая жаночая доля, але таксама досыць шырока прадстаўлены шлюбныя матывы і ўзаемаадносіны ў маладзёвым калектыве вясковай грамады:

"*Зашумела зялёная дубраўка / А на заходзе сонца. / Забалела у малойца галоўка, / Што чужая старонка. / Няма у малойца ні таткі, ні мамкі, / Ні брата, ні сястрыцы. / Некаму малойцу і хустачку даці, / Галоўку абвязаці. / Абабралася чужая-чужаніца / Красная дзявіца. / Дала малойцу чырвонага шоўку / Абвязаці галоўку. / Каб малойца галоука не балела, / На сэрца не ташніла*"[7].

Насычаныя тонкім лірызмам і вобразнасцю, жніўныя песні ўвасаблялі спадзяванні маладых жанчын на шчаслівую шлюбную долю:

"*Ой, не захадзі ты, яркае сонца. / Ка мне ў вакенца. / Ой, не запякай цела маё бела, / А ліцо румяна. / Маё цела бела, як пагода, / А лічка румяна. / Ой, не заязджай, нялюбае падруж'е, / На маё надвор'е. / Ой, не задавай маёй маладосці / Смертнасці і жалосці. / Ой, заедзь, заедзь, харошы, прыгожы, / На маё надвор'е, / Прывядзі маёй маладосці / Радасці й весялосці. / Да маё ліцо / Без бяліла бела, / Без красіла красна. /Бялілечка да на моры, /Крымлечка – у каморы, / Ну-це, ну-це, шчэ папільнуйце / Вячэрняй парой. /Халадком з расой, /Сярпом – не касою*"[8].

Калі справа набліжалася да завяршэння, праводзіўся абрад "завівання барады". Гэты старажытны звычай звязаны з глыбокай пашанай духу поля, які хаваецца ў апошнім нязжатым снапе. На Аршаншчыне гэты абрад праходзіў так: усярэдзіне незжатага лапіка поля пакідалі хлеб і соль, над якімі звязвалі каласы – «завівалі бараду». Потым гэтую «бараду» зрэзалі сярпом і дадавалі ў апошні сноп, а на галаву старэйшай жнеі апранаўся вянок з каласоў гэтага снапа [5, с. 205].

Пасля завівання «барады» жнеі пачыналі катацца па зямлі, па полі. Пры гэтым яны прасілі зжатую ніву вярнуць іх сілу. Пасля гэтага апошні сноп прыгожа прыбіралі і неслі ў хату гаспадара поля. Сярод усіх жней выбіралася самая прыгожая дзяўчына, якая ўзначальвала шэсце з дажыначнага снапом. Гаспадары сустракалі жней хлебам-соллю, а дажыначнага сноп займаў сваё пачэснае месца пад абразамі.

**Дзяды.** Адметнай рысай беларускага народа заўсёды з'яўлялася павага да сваіх продкаў, да сваіх каранёў. У календары беларусаў было больш за пяць урачыстых дзён у годзе, калі памінáлі памерлых, і гэтыя дні звычайна называліся Дзяды. Святкавалі іх на Масленіцу, на Радуніцу, на Тройцу, перад летнім святам Пятра і Паўла, а таксама восенню. Восеньскія Дзяды заўсёды лічыліся самымі галоўнымі. Праўда, адной дакладнай даты святкавання не было.

[6] Запісаў аўтар (ЗА) у 2017г. ад Паўлючэнка Ларысы Аляксандраўны, 1953 г.н., у в. Коханава Аршанскага р-на.
[7] ЗА у 2017г. ад Паўлючэнка Ларысы Аляксандраўны, 1953 г.н., у в. Коханава Аршанскага р-на.
[8] ЗА у 2016г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава Аршанскага р-на.

Звычайна восеньскія Дзяды адзначаліся на трэцюю суботу пасля Пакроваў (14 кастрычніка), але ў розных рэгіёнах даты маглі мяняцца. У сучаснай Беларусі гэта свята выразна зафіксаваны – 2 лістапада ў нас адзначаецца Дзень памяці. Дзядамі называлі ня саміх продкаў, а іх душы [6, с. 386].

У гэты дзень – дзень святкавання Дзядоў – было прынята ўладкоўваць вячэру ў гонар памерлых продкаў. Перад гэтым усе члены сям'і мыліся ў лазні. Пры гэтым трэба было абавязкова пакінуць трохі вады і венік, каб продкі таксама маглі памыцца, і прыйшлі да вячэры чыстымі [4, с. 496].

Продкі павінны былі добра паесці і павесяліцца, інакш яны маглі б наслаць няшчасці на сям'ю. Пачынаў вечар гаспадар дома: ён са свечкай у руках абыходзіў святочны стол, а потым адкрываў ўсе дзверы і вокны і клікаў продкаў на вячэру. Клікаць трэба было ўсіх па імёнах. Гэта даказвала, што свой род шанавалі і памяталі ўсіх, хто даў жыццё сям'і. У Аршанскім рэгіёне прынята перад вячэрай казаць наступнае «Пріходзіце дзяды з намі дзедаваць, але вам нельга – таму мы за вас паядзім»[9]

З нагоды страў адзінства не было: у нейкіх месцах на стол ставілі цотная колькасць страў, у нейкіх – няцотная. Некаторыя сцвярджалі, што на стале павінна быць толькі тры стравы, а выпіць можна было толькі тры чаркі. Асаблівасцю памінальнай трапезы на Аршаншчыне з’яўлялась абавязковая прысутнасць сярод абрадавых страваў бліноў. Але як бы не адрозніваліся звычаі, аб'ядноўвала іх адно – на стале абавязкова стаяла дзедаўская міска і чарка. Кожны член сям'і адліваў у яе пітво і накладаў ежы. Гэта значыць: сам узяў і з продкам падзяліўся. Часцей за ўсё стравы пакідалі на стале, каб продкі маглі спакойна балявацъ да раніцы.

Падчас вячэры ўспаміналі свой род, сваіх дзядоў і прадзедаў. Распавядалі пацешныя выпадкі, звязаныя з імі, іх саветы. Пад канец вячэры падыходзіў да канца, гаспадар прамаўляў малітву, а потым тушыў свечку. Рабілася гэта альбо кавалачкам хлеба, альбо бліном. Пасля гэтага ўсе глядзелі, куды пойдзе дым. Калі ён ішоў уверх, то ў сям'і ўсё павінна было быць добра. А калі ён ішоў у бок, асабліва да дзвярэй, то ў хаце неўзабаве павінен быў быць нябожчык. Яшчэ ў канцы трапезы гаспадар прамаўляў такія словы: “Дзяды, пагасцявалі у нас, папіравалі, а цяпер ідзіце!”[10]

**Каляды.** Каляды для продкаў сучасных беларусаў былі галоўным зімовым святам, якое было звязана ў першую чаргу з днём зімовага сонцастаяння і сімвалізавала пачатак новага года – і сонечнага, і сельскагаспадарчага. Святкаванне пачыналася 25 снежня і працягвалася да 6 студзеня. З прыняццем хрысціянства і ўвядзеннем Грыгарыянскага календара ў 16 ст., каталіцкая канфесія пачынала святкаваць Каляды з 25 снежня па 6 студзеня, а праваслаўныя, што прытрымліваюцца Юліянскага календара, – з 6 студзеня да 19 студзеня – Вадохрышча [4, с. 296].

Назва гэтага свята – Каляды – паганскае. Існуе здагадка, што само слова «Каляда» паўстала ад слова «кола» – сонца. Па адной з версій, гэта слова сімвалізавала Сонца, якое пачанае перамагаць цемру – тут мелася на ўвазе павелічэнне светлавога дня. Па іншай версіі гэта назва расшыфроўвалася, як «кол-яду», «кругавая ежа». Тлумачылася гэта тым, што калядоўшчыкі хадзілі вялікай кампаніяй па дварах з песнямі, скокамі і перапрананнямі. За гэта ім выносілі ежу, якую яны потым усё разам і з'ядалі.

Каляды лічыліся асаблівым святам, таму і рыхтаваліся да іх адпаведна. Калолі свінню (у бедных сем'ях гэта быў адзін з нешматлікіх дзён, калі можна было паесці мяса ўдосталь), рабілі генеральную ўборку ў доме, шылі новыя ўборы, а таксама старанна мыліся ў лазні. Сустракаць гэтае свята належыла чыстым: і фізічна, і духоўна [3, с. 424].

Само свята праходзіла па выразна вывераным сцэнары, прытрымлівацца якога было абавязкова. Увечары 6 студзеня людзі чакалі з'яўлення першай зоркі на небе і толькі пасля гэтага садзіліся за святочны стол. Адным з абавязковых атрыбутаў абрадавай вячэры было сена, якое ляжала пад абрусам да самага Шчадрэца (13 студзеня), і па якім варажылі на будучы ўраджай і асабісты лёс. На стале павінны былі быць куцця і адвар, а ежа была вельмі сытнай, мясной – бліны, смажаная каўбаса і г.д. Адварам нашы продкі называлі кампот з сушаных яблыкаў і груш.

У першы калядны дзень – 7 студзеня – было прынята наведваць сваіх хроснікаў, дарыць ім падарункі. Увечары наступаў час моладзі. Вялікія кампаніі па 10-15 чалавек пераапраналіся ў цыганоў, у мядзведзяў, абавязкова апраналі аднаго з членаў групы казой. На Аршаншчыне акрамя гэтага рабілі зорку. Калядоўшчыкі спявалі песні, прыпеўкі, танцавалі, славілі гаспадара дома і яго сям'ю. За гэта іх адорвалі усялякімі прысмакамі і дробнымі грашыма. Зачыніць перад калядоўшчыкамі дзверы азначала наклікаць бяду і на дом, і на гаспадарку.

Другі дзень Калядаў зваўся днём святога Сцяпана. У гэты дзень гаспадары расплачваліся са сваімі работнікамі, пасля чаго тыя маглі выказаць усе свае крыўды. Скончыўшы з высвятленнем адносін, гаспа-

[9] ЗА у 2016г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава Аршанскага р-на.
[10] ЗА у 2017г. ад Ляшнеўскай Галіны Яўгенеўны, 1946 г.н., у в. Белева Аршанскага р-на.

дары і работнікі ці заключалі новы дагавор на год, ці разыходзіліся. Пра гэты дзень нават захавалася прымаўка «На сьвятыя Сцяпан кожны сабе пан».

Абавязковым атрыбутам Калядаў былі варожбы. Варожбы пачыналіся 6 студзеня і працягваліся да Шчадрэца. Дзяўчаты кідалі боцік з левай нагі праз плячо, у які бок глядзеў насок, адтуль і наканаваны прыйдзе. Дзве іголкі нацiралi салам і апускалі ў ваду. Калі пойдзе на дно, то год будзе няўдалы, а калі сыдуцца разам, то быць у гэтым годзе замужам. Варажылі і на паленцах. Дзяўчына брала наўздагад адно палена, па якім і вызначалі якасці жаніха. Калі палена было гладкае, значыць, жаніх будзе прыгажуном, калі шурпатае – непрыгожым. Калі траплялася палена з сучкамі, значыць, ён будзе з вялікай сям'і. Крывое палена азначала, што муж будзе непрывабным[11].

З песнямі і танцамі святкавалі і Шчадрэц (13 студзеня). Гаспадары імкнуліся не скупіцца на пачастункі, каб наступны год быў паспяховым. Таксама ў гэты час пяюцца песні якія гавораць аб забароненай ежы у час посту. Як прыклад, песня з Аршанскага раёну " А на гарэ елка "

"*А на гарэ елка схіляся / Схіляся, схіля / Пад ёй зайка туляўся / Туляўся, туляўся / Дзеўкі зайца лавілі / Лавілі, лавілі / А мальчыкі лупілі / Лупілі, лупілі / Дзеўкі селі за сталом / За сталом, за сталом / А мальчыкі пад сталом / Пад сталом, пад сталом / Деўкі елі мясюгу / Мясюгу, мясюгу / А мальчыкі касцюгу / Касюгу, касцюгу / Дзеўкі ядуць смяцца / Смяюцца, смяюцца / А мальчыкі грызуцца / Грызуцца, грызуцца / А на гарэ елка схіляся / Схіляся, схіляся*"[12].

У вёсцы выбіралі самую прыгожую дзяўчыну – Шчодру – і апраналі на яе вянок і стужкі. На чале са Шчодрай працэсія хадзіла па вёсцы і спявала шчадроўкі, якія пачыналіся са слоў «шчодры вечар, добры вечар».

Тры куцці (абрадавых вячэры) было на працягу калядных святок. Першая куцця называлася вялікай і праводзілася напярэдадні Калядаў. Яна была поснай. Другая куцця называлася багатай (Шчодрай) і праводзілася перад Новым годам. Стол ламіўся ад разнастайных сытных страў, нават куцця рыхтавалася на сале або масле. Трэцяя куцця таксама была поснай, вадзяной. Падчас яе праходзіў абрад, які атрымаў назву «запісванне калядаў». Гаспадар дома ў гэты вечар выходзіў з мелам і маляваў крыжы на ўсіх варотах і дзвярах, каб абараніць свой дом і сваю гаспадарку ад нячыстай сілы[13].

Такім чынам, сярод найбольш знакавых і шанаваных абрадаў восеньска-зімовага перыяду ў беларусаў Аршаншчыны былі Дажынкі, восеньскія Дзяды і Каляды. Аднак, падчас савецкага перыяду беларускай гісторыі старажытнае свята Каляды практычна не святкавалася. Праўда, у 60-70-я гады гэта традыцыя стала адраджацца, але на атэістычнай аснове. У пачатку 1990-х гг. Каляды сталі паволі вяртацца ў ўклад жыцця беларусаў. Калядуюць цяпер у асноўным з 7 на 8 студзеня. Калядоўшчыкі зноў сталі пераапранацца, а гаспадары імкнуцца надарыць іх шчадрэй, каб год быў удалым. Што датычыцца памінальнай традыцыі, то святкаванне восеньскіх Дзядоў мае больш устойлівы характар. А спецыфікай святкавання Дажынак на сучасным этапе стала тэатралізацыя абрада і яго перамяшчэнне з прыватных гаспадарак у сельскагаспадарчыя прадпрыемствы і ўстановы культуры.

ЛІТАРАТУРА

1. Веснавыя песні / Склад. Г.А.Барташэвіч, Л. М. Салавей; склад.муз. часткі В. І. Ялатаў; рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979. – 608 с.
2. Валачобныя песні / склад. Г.А.Барташэвіч, Л. М. Салавей; Склад.муз. часткі В. І. Ялатаў; Рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск: Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.
3. Гілевіч, Н. С. Песні народных свят і абрадаў / Уклад. і рэд. Н.С. Гілевіча. – Мінск.: Выд-ва БДУ, 1974. – 464 с
4. Зеленин, Д. К. Восточнославянская этнография / Д. К. Зеленин / Пер. с нем. К. Д. Цивиной. Примеч. Т. А. Бернштам, Т. В. Станюклвич и К. В. Чистова. – М.: Наука, 1991. – 511 с.
5. Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Весенние праздники / Отв. ред. С. А. Токарев. – М.: Наука, 1977. – 358 с.
6. Левкиевская, Е. Е Славянский оберег: Семантика и структура / А. Е. Левкиевская. – М.: Индрик, 2002. – 334 с.
7. Лозка, А. Ю. Беларускі народны каляндар / Аўт.-уклад. А. Ю. Лозка; Маст. А. І. Дашкевіч. – Мінск.: Полымя, 1992. – 205 с.

[11]ЗА у 2017г. ад Ляшнеўскай Галіны Яўгенеўны, 1946 г.н., у в. Белева Аршанскага р-на.
[12] ЗА у 2016г. ад Франковай Вольгі Сцяпанаўны, 1927 г.н., у в. Балбасава Аршанскага р-на.
[13]ЗА у 2017г. ад Ляшнеўскай Галіны Яўгенеўны, 1946 г.н., у в. Белева Аршанскага р-на.